© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011


# БАЦЬКАЎШЧЫНА

ОРГАН БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВОЛЬНАЙ ДУМКІ

WHITERUTHENIAN NEWSPAPER "BACKAUSCYNA" ("FATHERLAND")
Authorized by EUCOM Hqs Civil Affairs Division, 1. January 1951, Nr. UNDP 225
Responsible Publisher: Wladimir BORTNIK
Printing Office: Buchdruckerei der Apostolischen Visitatur, München 8, Rosenheimer Straße 46a. — Telefon-Nr. 45 81 43
Circulation: 3500 copies. Sponsor: IRO
Post Adress: "Backauscyna", München 22, Herzog-Rudolf-Straße 49/III
Die Administration der Weißruthenischen Zeitung „BACKAUSCYNA"
München 22, Herzog-Rudolf-Straße 49/III

ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ — ЦАНА 30 Н. ФЭН.

DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „DAS VATERLAND" | THE WHITERUTHENIAN NEWSPAPER „THE FATHERLAND" | LE JOURNAL BIELORUSSIEN „LA PATRIE"

№ 77 | Нядзеля 16 сьнежаня 1951 г. | ГОД ВЫДАНЬНЯ 5


# 6-ая Сэсыя Рады Беларускай Народнай Рэспублікі

28-га кастрычніка сёлета распачалася ў Нью-Ёрку 6-ая пасьля апошняй сусьветнай вайны Сэсыя Рады Беларускай Народнай Распублікі.

Із 123 сяброў Рады замежных сэктараў 65 мелі тэхнічную магчымасьць прыняць у сэсыі ўдзел беспасярэдна, астальныя прыслалі свае пастановы й дэзыдэраты пісьменна, датычныя пытаньняў, пастаўленых на парадку дня сэсыі.

З прычынаў цяжкіх матарыяльных абставінаў сяброў Рады (занятыя заработнай працай) Прэзыдыюм Рады пастанавіў праводзіць паседжаньні 6-ай сэсыі ў суботы й нядзелі, а ў буднія дні праводзіць вечарамі працу камісыямі. 6-ая сэсыя Рады дзеля таго закончыцца толькі дзесь пад канец студзеня 1952 г. Гэткае ўплянаваньне працы дасьць магчымасьць і аддаленым адлегласьцю сябром Рады надсылаць сэсыі свае сугэстыі, узьнікаючыя й выкліканыя ў іх бегам часу ды агульнымі падзеямі.

Два першыя паседжаньні сэсыі былі прысьвечаныя пытаньню беларуска-расейскіх дачыненьняў. Дыскусыі ў плашчыні — магчымае ці немагчымае супрацоўніцтва беларусаў з расейцамі — мелі вельмі жвавы характар.

Прысьвячэньне сэсыяй аж столькі часу гэтаму пытаньню тлумачыцца тым, што ў пяршыню за апошніх 30 гадоў расейская антыбальшавіцкая эміграцыя зьвярнулася да Рады БНР з прапазыцыяй утварыць супольны антыбальшавіцкі фронт змаганьня, а па другое, што дзеля ўтварэньня такога фронту пасярэднічаюць між расейцамі й нерасейскімі народамі СССР пэўныя амэрыканскія дзейнікі.

Дзеля гэтага вось 6-ая сэсыя Рады БНР і падыйшла да гэтага пытаньня так паважна, разглядаючы яго грунтоўна й усебакова, ня гледзячы на тое, што пляцформа, выпрацаваная 5-ма расейскімі партыямі і прапанаваная імі, як такая, для ўтварэньня супольнага фронту змаганьня, не давала ніякіх падставаў для дыскусыяў.

Дыскусыі таму вяліся не па зьместу прапанаванай плятформы 5-ці расейскіх партыяў. У гэтым сэнсе ў сяброў Рады ніякіх разыходжаньняў ня было й прапанаваная 5-ма расейскімі партыямі плятформа была аднагалосна Радай адхілена.

Паўсталі затое пэўныя разьбежнасьці ў справе далейшых дачыненьняў Рады да праектаванага расейцамі й амэрыканцамі супольнага фронту змаганьня з бальшавізмам.

Паважная часьць сяброў Рады выказвалася за рашучае прыпыненьне ўсялякіх размоваў з расейцамі, пакуль апошнія не зракуцца ўсялякіх сваіх імпэрыялістычных прэтэнсыяў да Беларусі, да сувэрэнных правоў беларускага народу. Бальшыня сяброў Рады аднак заняла такое становішча, што іменна каб прымусіць расейцаў зрачыся іхных неабаснаваных да нас прэтэнсыяў, патрэбна зь імі гутарыць, а тым балей, што ў гэтых гутарках пасярэднічаюць амэрыканцы, хоць і ў ролі прыватных асобаў, але асобаў, што маюць не абы якія ўплывы ў амэрыканскім грамадзянстве, прэсе ды палітычных сфэрах.

Пагроза «шабляй, стрэльбай маскалю» з нашага боку ў дадзеным выпадку была-б больш, як не дыпляматычнай. Такая «мова» нас адно скампрамітавала-б і прынесла-б нам неаблічальныя шкоды, бо гэтым-бы мы паказалі сябе толькі людзьмі палітычна недасьпелымі.

Ніводзін у сьвеце палітычна дасьпелы народ не рэагуе гэтак на прапазыцыі свайго праціўніка, калі апошні прапануе першаму паразумецца мірным шляхам.

Аружнае змаганьне, вайна, гэта ўжо апошняя й самая скрайняя форма абароны сваіх нацыянальных правоў. Яна часамі зьяўляецца й бязвыхадна-неабходнай, але іменна, як самая скрайняя й прыносячая найбольш няшчасьцяў абодвым бакам, ёсьць усім непажаданай. Дзеля гэтага раней, як прыступіць да разьвязкі такіх супярэчнасьцяў збройна, праводзіцца доўгімі гадамі, на'т дзесяткамі гадоў ходаньне дыпляматычнае.

Благім абароньнікам свайго народу ўважаецца ў сьвеце такі палітык, які зь першых няпрыемных яму прапановаў замахаў кулаком, ня выпрабаваўшы ўсіх магчымасьцяў дайсьці да мірнага паразумленьня. Такіх «дыпляматаў» адклікаюць зь іх становішчаў, а на іх месца назначаюць новых.

Гэта — клясычная, вякамі практыкаваная рэгула ўсімі дзяржаўнымі народамі сьвету — павінна быць і ўзорам для нас беларусаў, бо гэтак паступаюць навет такія дзяржавы, якія, здавалася-б, сваей перавагай сілы маглі-б найлягчэй падпарадкаваць сабе свайго праціўніка. Церпялівасьць, вытрымка й такт у дыпляматычным ходаньні даюць карысьць таму, хто гэтую цярплівасьць мае. Нэрвы, гарачка прыносяць толькі шкоду.

Выканаўчыя органы Рады БНР дзеля таго правідлова паступілі, увайшоўшы ў перагаворы з 5-ма расейскімі партыямі на іх прапанову знайсьці паразумленьне мірным шляхам. Гэтак-жа правідлова паступіла 6-ая сэсыя Рады БНР, ня «хлопнуўшы дзьвярыма» перад пяцьцю расейскімі партыямі.

Іншая справа, якіх пазыцыяў прадстаўнікі Рады БНР у гэтых перагаворах, канфэрэнцыях павінны трымацца. Ніжэй зьмешчаная пастанова 6-ай сэсыі Рады БНР дае нам адказ поўнасьцю на гэтае пытаньне. Яна дае нам поўную гарантыю, што Рада БНР ня сыйдзе із сваіх пазыцыяў, на якіх яна стаяла 33 гады.

Аргумэнты некаторых сяброў, што Рада БНР сваімі перагаворамі з расейцамі ў выпадку недагавораньня з апошнімі (чаго найбольш трэба спадзявацца) адчыніць толькі дзьверы групе Астроўскага да супрацоўніцтва з расейцамі й дасьць ім падставы ды апраўданьне ў іхняй далейшай русафільскай акцыі, ня вытрымліваюць ніякай крытыкі. Бо калі-б па разрыву перагавораў Рады БНР з расейцамі ў выніку няўступлівасьці апошніх із сваіх імпэрыялістычных пазыцыяў група Астроўскага апынулася ў створаным расейцамі блёку, дык гэта-б толькі яшчэ раз паказала наглядна беларускаму грамадзянству, што астроўшчыкі згодныя на ўсё, на што ня могуць згадзіцца праўдзівыя беларусы.

Для агентурнай працы нікому й ніякіх дзьвярэй адчыняць ня трэба, як таксама іх нельга зачыніць. Гэта мы бачылі таксама вельмі наглядна хоцьбы ў 1948 годзе навакол нашага змаганьня за Беларускую Аўтакефальную Праваслаўную Царкву з расейскім зарубежжам.

Дзеля гэтага ў выпадку разрыву перагавораў Рады БНР з расейцамі ніякай кампрамітацыі Рады ня будзе й ніякіх аблягчэньняў для беларускай агентуры нашымі перагаворамі ня створыцца. А наадварот.

**Прысутны на Сэсыі Рады**

# Пастанова 6-ай Сэсыі Рады БНР

## у справе Антыбальшавіцкага Фронту Змаганьня

**Заслухаўшы даклад прэз. М. Абрамчыка аб агульнай сытуацыі й абмяняўшыся інфармацыямі аб актуалізаваньні паняволенымі бальшавікамі народамі ідэі ўтварэньня агульнага фронту змаганьня з бальшавізмам і зачытаўшы пастановы Сэктараў Рады БНР у Ангельшчыне, Бэльгіі, Нямеччыне, Францыі, Аўстраліі, Аргентыне, ЗША, датычныя гэтага пытаньня, па перавядзеньні дыскусыяў, 6-ая Сесыя Рады БНР пастанаўляе:**

**1. Вітаючы ўсялякую ініцыятыву, скуль і ад каго яна-б не паходзіла, у кірунку ўтварэньня супольнага фронту змаганьня з бальшавізмам, Рада БНР уважае адылі найбольш мэтазгодным утварэньне такога супольнага фронту, у які-б былі ўлучаныя ўсе паняволеныя бальшавікамі народы, незалежна ад таго, у якой форме сувязі гэныя народы знайходзяцца сяньня з СССР і незалежна ад часу іхнага паняволеньня.**

**6-ая Сэсыя Рады БНР дзеля гэтага даручае сваім выканаўчым ворганам у першую чаргу падтрымліваць, як эвэнтуальна выказваць сваю собскую ініцыятыву па ўтварэньні агульнага фронту змаганьня з бальшавізмам із усіх паняволеных бальшавікамі народаў.**

**2. Выканаўчыя ворганы Рады БНР могуць улучацца толькі ў такія супольныя фронты змаганьня з бальшавізмам, у якіх:**

**а). Прызнаецца наўзаем, уваходзячым у гэткі блёк народам, бязумоўнае і бяз усякіх засьцярогаў роўнае права, як народам. Вылучаюцца якія-б то ні былі прывілеі якога-б то ня было народу, уваходзячага ў гэны блёк, ці то абапёртыя на лічбовай перавазе насельніцтва таго ці іншага народу, ці на прывілеях, здабытых у мінулым, зь якіх дадзены народ карыстаўся дзякуючы фізычнаму паняволеньню слабейшых народаў.**

**б). Прызнаецца ўсімі ўваходзячымі ў гэты блёк народамі права беларускага народу на дзяржаўную незалежнасьць і сувэрэннасьць у этнаграфічных граніцах Беларусі, адноўленую абвешчаньнем Акту 25-га Сакавіка 1918 г.**

**3. Лічучыся адылі з магчымасьцю, што ўтварэньне такога шырокага фронту, у які-б улучыліся ўсе паняволеныя бальшавікамі народы, у бліжэйшым часе зьдзейсьніць не ўдалося-б із прычынаў незалежных ад беларусаў, а прадставіліся-б рэальныя магчымасьці ўтварэньня падобнага блёку змаганьня з бальшавікамі ў вузейшым маштабе, як блёку рэгіянальнага, 6-ая Сэсыя Рады БНР дапаручае сваім выканаўчым ворганам улучыцца ў гэткі блёк, але вылучна й толькі на такіх умовах, як пералічана ў пункце 2-ім гэтае пастановы.**

**4. Усялякія адхіленьні ад пералічаных у пункце 2-ім умоваў, зробленыя выканаўчымі ворганамі Рады БНР у парадку ўзаемнага, у ваднолькавай ступені роўнага кампрамісу, набіраюць моцы толькі па ратыфікацыі Радай БНР.**

**5. Выканаўчыя ворганы Рады БНР павінны безадкладна выступіць, эвэнтуальна адклікаць сваіх прадстаўнікоў з такога блёку, у якім-бы талеравалася акцыя таго ці іншага народу ў кірунку накіданьня свае палітычнае гэгэмоніі як унутры такога блёку, так і прапагандай свайго зьверхніцтва навонкі.**

**6. 6-ая Сэсыя Рады БНР адхіляе поўнасьцю пляцформу 5-ёх расейскіх партыяў, прапанаваную ў форме «Союза Освобождения Народов России», як не даючую ніякіх падтаваў для дыскусыяў дзеля ўтварэньня супольнага фронту змаганьня з бальшавізмам.**

**7. Выканаўчыя ворганы Рады БНР могуць прыймаць удзел ува ўсіх нарадах і канфэрэнцыях народаў СССР, з удзелам расейцаў, прызначаных для выпрацаваньня новае плятформы супольнага фронту змаганьня з бальшавізмам, але прадстаўнікі Рады БНР ня могуць падпісваць ніякіх дэклярацыяў ці забавязаньняў, праклямуючых салідарнасьць у якой-бы то ня было супольнай акцыі з расейцамі, пакуль апошнія публічна не задэклярують прызнаньня прынцыпаў, сфармуляваных намі ў пункце 2-ім гэтае пастановы.**

**Нью Ёрк, 28 кастрычніка 1951 г.**

**А. Махноўскі**
**Старшыня Сэсыі Рады БНР**
**А. Шукелайць**
**Сакратар**

# Выясьненьне ў справе Вісбадэнскай Канфэрэнцыі

Вісбадэнская нарада, што адбылася 2—7 лістапада, нарабіла шмат шуму й была па рознаму, у бальшыні, хвальшыва камэнтаваная.

Прэзыдыюм Рады БНР дзеля таго лічыць патрэбным даць наступныя выясьненьні:

1. што Вісбадэнская нарада перадусім была скліканая не расейскімі 5-ма партыямі, а амэрыканцамі з мэтай даць магчымасьць народам СССР правесьці дыскусыі супольна з расейцамі,

2. што на Вісбадэнскай нарадзе ня была выробленая **ніякая супольная палітычная пляцформа ані падпісаны ніякі дагавор,** а выбраная толькі мяшаная міжнацыянальная камісыя, мэтай якой ёсьць падрыхтаваць і склікаць наступную нараду-канфэрэнцыю дзеля апрацоўкі й прыняцьця супольнай палітычнай пляцформы па ўтварэньні агульнага фронту змаганьня з бальшавізмам,

3. што апублікаваная дэклярацыя ад 7 лістапада ад імя ўдзельнікаў Вісбадэнскай нарады не зьяўляецца **ніякім праўна забавязваючым Раду БНР** дакумэнтам, дзеля таго, што гэтая дэклярацыя мела перадусім на мэце прадэманстраваць салідарнасьць народаў СССР у сваім жаданьні супольна змагацца з бальшавізмам, а па другое, што навет у такой форме дэклярацыя гэта была падпісана прадстаўніком выканаўчага органу Рады БНР **умоўна,** засьцярогшы яе ратыфікаваньне ці нератыфікаваньне Радай БНР.

6-ая сэсыя Рады БНР на 2-ім паседжаньні 11. 11. 51, разглядаючы дэклярацыю Вісбадэнскай нарады, апрабавала яе толькі ў тых пунктах, дзе гаворыцца аб супольным фронце змаганьня з бальшавізмам народаў СССР да поўнае іх перамогі над бальшавізмам і **не апрабавала** 2-га пункту дэклярацыі, у якім гаворыцца аб «самавызначэньні народаў», як пункту не адпаведнага для беларускага народу, які ўжо самавызначыўся ў 1918 г. Актам 25 Сакавіка.

На 3-ім паседжаньні сэсыі Рады дня 25. 11. 51 г. па прыняцьці пастановы паслаць прадстаўнікоў Рады БНР на наступную праектаваную канфэрэнцыю народаў СССР, была выбраная спэцыяльная камісыя, якая апрацуе ў духу пастановы, прынятай сэсыяй 28 кастрычніка, дакладныя інструкцыі будучым дэлегатам Рады БНР на тэй праектаванай канфэрэнцыі народаў СССР.

Такім чынам, як бачым, да гэтага часу Рада БНР **ня мае ніякіх забавязаньняў** ў дачыненьні да праектаванага супольнага фронту змаганьня з бальшавізмам народаў СССР, а ў тым ліку й 5-ці расейскіх партыяў, а што йдуць толькі перагаворы, ці, лепш кажучы, падрыхтоўка працы да перагавораў у форме запраектаванай супольнай канфэрэнцыі.

Як будзе пасоўвацца праца далей, прэзыдыюм Рады будзе інфармаваць беларускае грамадзянства праз сваю прэсу.

Нью Ёрк, 26. 11. 1951.

**Сакратарыят Прэзыдыюму Рады БНР**

# СЛУЦКІ ЧЫН

Слуцкае Паўстаньне, 31-ую гадавіну якога адзначаем сяньня, зьяўляецца адным з найбольш выдатных, слаўных і важных мамэнтаў у гісторыі вызвольнага змаганьня Беларускага Народу.

1920 год, у якім меў месца славуты чын адважных Случчакоў, быў багаты падзеямі для Беларускага Народу. У той час, калі Захад Эўропы залечваў ужо свае раны пасьля першай сусьветнай вайны, на Беларусі шалела яшчэ ваенная завіруха, прыносячы сьмерць і далейшыя спусташэньні. Тут разыгрывалася, як і неаднакратна ў мінуўшчыні, зацятае змаганьне між бальшавіцкай Расеяй і Польшчай за панаваньне над нашым краем. Толькі калі ў мінуўшчыні ў працэсе падобных змаганьняў Беларускі Народ быў пераважна пасыўным аб'ектам, то цяпер, прабудзіўшыся ад векавога сну, голасна заявіў, што ён, а ня хто іншы, павінен быць гаспадаром на сваей собскай зямлі, заявіў гэтую сваю нязломную волю ня толькі словам, але й чынам аружжа. Дзеля гэтага Слуцкае Паўстаньне было найбольш вымоўным задэманстраваньнем імкненьняў Беларускага Народу жыць вольным і незалежным жыцьцём.

«Тым, што паўсталі й пайшлі паміраць, каб жыла Бацькаўшчына!» Словы гэтыя вышылі собскімі рукамі Слуцкія сялянкі на баявым сьцягу паўстанцаў — сваіх сыноў і мужоў, братоў і бацькоў. Можа нічога іншага, як гэтыя якраз словы найлепей выражаюць безгранічную ахвярнасьць і сьвядомы патрыятызм Случчакоў, які іх вёў у няроўны бой зь пераважаючым ворагам, каб цераз сваю сьмерць спрычыніцца да вызваленьня ад расейска-бальшавіцкае няволі роднае Бацькаўшчыны. «Паміраць, каб жыла Бацькаўшчына» — гэта прыгожы й як-жа праўдзівы для Беларускага Народу лёзунг, які першымі кінулі Слуцкія героі ў шэрых сялянскіх сьвітках і які ад гэтага часу становіцца неадлучным у змаганьні Беларускага Народу за ягонае вызваленьне. Бо пасьля крывавага здушэньня Слуцкага Паўстаньня з году ў год найлепшыя сыны Беларускага Народу й мільённыя сялянскія масы сьмела йшлі ў турмы, на катаргу ў далёкі Сібір і халодную Поўнач, ішлі на сьмерць, каб толькі жыла Бацькаўшчына.

Але Слуцкае Пайстаньне ёсьць для нас бязьмежна важным і дарагім ня толькі таму, што Бегарускі Народ праявіў у цяжкіх баёх на палёх Случчыны бязьмежную ахвярнасьць у змаганьні. Яно хавае ў сабе яшчэ й іншыя, ня менш важныя вартасьці.

Беларускі Народ зьяўляецца волялюбным народам і гэтую сваю волялюбнасьць на працягу ўсяе нашае гісторыі задакумэнтаваў ня толькі словам, але й збройным чынам. Толькі за панаваньня цара Мікалая I на Беларусі было ўрадава зарэгістравана аж 605 сялянскіх бунтаў. Збройныя чыны Беларускага Народу, якія ніколі не заціхалі ад часу, як нашая Бацькаўшчына знаходзілася ў няволі, былі потым укаранаваныя паўстаньнем Каліноўскага.

Але ўсе гэтыя паўстаньні былі толькі стыхійнымі ўзрухамі, распачлівымі актамі пратэсту супраць бязьмежных крыўдаў і цяжкага нявольніцтва, а ня мелі ў сабе затое яснай і канкрэтнай мэты. Слуцкае-ж Пайстаньне было першым сьвядомым чынам, мэтаю якога была абарона гаспадарстваўскай незалежнасьці Беларусі, абвешчанай Актам 25 Сакавіка 1918 г. Рада Случчыны на пярэдадні выбуху паўстаньня 21 лістапада 1920 г. зьвяртаецца да народу з Дэклярацыяй, у якой між іншага гаворыць: **«У мамэнт самавызначэньня ўсіх народаў і змаганьня іх за сваю самастойнасьць і свабоду Беларуская Рада выконвае волю сялянства, паслаўшага яе й даверыўшы ей абарону незалежнасьці нашае Бацькаўшчыны, заяўляе ўсяму сьвету аб дамаганьнях, намерах беларускага сялянства, аб тым, што Беларусь павінна быць вольнай і незалежнай Рэспублікай у яе этнаграфічных межах».**

З гэтых словаў Рады Случчыны, якая кіравала паўстаньнем, бачым, што Слуцкае Паўстаньне было ня стыхійным змаганьнем супраць бальшавікоў, не

(Заканчэньне на 2. балоне)

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011



# ПРЫРАЧНЫЯ РАЕНЫ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

**(Заканчэньне)**

На поўдзень ад Рэчыцкага раёну ляжыць Хойніцкі раён. Ён сваей заходняй часткай упіраецца ў Мазырскую акругу й даходзіць да самых нізін і балот Прыпяці. Раён падзяляецца на дзьве часткі: лясную й палявую. У лясной частцы гаспадарка вялася па палеску. Насельніцтва трымала многа жывёлы палескай пароды, г. зн. мала малочнай, але буйнай ростам і непераборлівай на корм. Палескія землі мала ўрадлівыя, патрабуюць часта ўгнаеньня, таму навет заможныя гаспадары не заўсёды былі забясьпечаны хлебам. Вось-жа рагатая жывёла й была аснаўной крыніцай дабрабыту паляшука. На вялікіх выпаслых прасторах к восені жывёла добра адпасвалася й нагульвала вагу. Часьць жывёлы прадавалася на хлеб і іншыя патрэбы.

Асабліва былі ў цане вялізарныя, рагатыя, палавыя валы, якія дасягалі больш тоны вагою. Іх ахвотна куплялі на адкорм брагою пры браварох. Вол гэта карабель Палесься. Конь на Палесьсі не адыгрывае ролі ў сельскай гаспадарцы. Ён тут маларослы й слабасільны. Адсутнасьць мурожнага сена канюшыны ды аўса ня спрыяюць разьвіцьцю конегадоўлі. Пры калектывізацыі пагалоўе рагатай жывёлы катастрафальна зьнізілася. Пад асаблівую няласку папаў вол. Ён быў прызнаны зусім непатрэбным у калгасе, бо яго павінен замяніць трактар з самаходам. Практычна трактар і самаход у ўмовах Палесься не замянілі вала. Дзе-ж трактару й самаходу праехаць па Палескіх гацях ды й апрацаваць зямлю на малых плошчах у 1—2 гэктары. Прыйшлося перамяніць прапаганду за трактар і пакланіцца валу. Усе гэтыя далёка ня мудрыя меры ляглі надзвычайным цяжарам на долю палескага калгасьніка. Пры савецкай уладзе ён рэдка калі бачыў у дастатку хлеб, а ў часы калектывізацыі ён бесьперастанку галадаваў.

Паўдзённа-усходняя частка Хойніцкага раёну мае ўрадлівую глебу, і тут добра родзіць усякае збожжа. Гэтая частка раёну розьніцца ад Палескай. Самы характар вядзеньня сельскай гаспадаркі мае тут другі кірунак.

Мястэчка Хойнікі знаходзіцца пры чыгуначнай станцыі. Пры чыгунцы пабудаваная й лесапільня. Усё завалена дрэвам, якое чакае адгрузкі або расьпілоўкі. Чыгунка значна ажывіла мястэчка, хоць цягнік прыходзіць і адходзіць толькі раз у суткі й то зь некалькімі толькі пасажырскімі вагонамі, якія прычэпліваюцца к таварнаму цягніку. Хойнікі параўнальна рухлівае мястэчка. Гэтаму руху значна спрые суседні Брагінскі раён, зь якога амаль уся сельска-гаспадарская сыравіна, асабліва зімою таксама адпраўляецца праз Хойнікі.

У вялікай вёсцы Бабчын Хойніцкага раёну да рэвалюцыі была другаклясная царкоўная школа, якая рыхтавала настаўнікаў для царкоўных школаў граматы. Гэтая школа не давала дастатковых як спэцыяльных, гэтак і агульных ведаў. Выхаваньне вучняў будавалася на пакорлівасьці й бясспрэчным паслушэнстве. Але ня ў гэтым справа. Школа мела бязумоўна станоўчы ўплыў на акалічнае сялянства. Яна выпусьціла сотні сялянскай моладзі, больш здольная й энэргічная частка якой шляхам упартай працы праз экстэрнат набывала правы настаўніка земскай школы. Сталася так, што з гэтага глухога кутка выйшла шмат вясковых настаўнікаў.

Пасьля рэвалюцыі Бабчынская школа была рэарганізаваная ў школу другой ступені з пэдагагічным ухілам. Зноў Бабчынскія выхаванцы папаўнялі настаўніцкія кадры, а многія зь іх атрымалі вышэйшую пэдагагічную асьвету. У пачатку калектывізацыі ў гэтай школе дзейнічаў вучнёўскі падземны антысавецкі гурток. Але быў ён цераз НКВД раскрыты. Энтузыястычная вучнёўская моладзь была жорстка пакараная ссылкай на далёкія й цяжкія прымусовыя працы. Панесла кару й частка настаўнікаў на чале з дырэктарам.

Адкуль-жа быў занесены ў гэтую глуш вольны дух ня толькі маўклівага пратэсту, але й дзеяньня вясковай школьнай моладзі? Гурток дзеяў у часы цяжкага націску на бескампрамісовае правядзеньне калектывізацыі, поруч зь якой праходзіла й раскулачваньне. Чулая моладзь ня толькі бачыла людзкія сьлёзы, пакуты, але й сама была захвачана гэтым гураганам. Вось-жа свой пратэст моладзь і выявіла ў арганізаванай праціўсавецкай дзейнасьці. Магчыма што на арганізацыю падземнага гуртка меў уплыў мясцовы паўстанскі атрад. Магчыма моладзь была захоплена рамантыкай дзейнасьці правадыра гэтага атраду Сапляка. Паўстанцы зарганізаваліся ў першыя гады савецкай улады, яны былі поўнымі гаспадарамі ў Хойніцкім, Брагінскім, Лояўскім раёнах і перакідаліся аж за Днепр, на Украіну.

Атрад быў зьліквідаваны толькі ў 1929 г., калі правадыр паўстанцаў Сапляк загінуў дзякуючы правакацыі. Сяляне спачувалі Сапляку, дапамагалі яму, перахоўвалі яго на сваіх хутарох, паважалі яго за адвагу, спрыт. Магчыма што асабістасьць вольнага й непакорнага правадыра мела ўплыў на арганізацыю падземнага гуртка ў сьценах Бабчынскай школы.

Брагінскі раён сваёю ўсходняю часткаю прымыкае к Дняпру. На Дняпру ёсьць і прыстань пад назвай Бабкі. Праз прыстань у часы навігацыі адпраўляюцца ўсякія грузы, асабліва сельска-гаспадарская прадукцыя, якою так багаты гэты раён. Параўнаўча з другімі мясьцінамі тут значна менш лясоў, але затое зямля тут урадлівая, дае багатыя ўраджаі пшаніцы, ячменю, проса, аўса. Вельмі добра расьце канюшына, табак-махорка, кармовыя буракі. Для дасьледчых мэтаў адзін год у саўгасе былі пасаджаныя цукровыя буракі Досьледы далі вельмі добрыя вынікі: буракі паказалі высокую цукровасьць пры добрым ураджаі. Стаяла пытаньне аб пабудове ў Брагінскім раёне цукровага заводу. Але гэтая ідэя была пахаваная й сталася ахвяраю йзноў-жа савецкай гігантаманіі, гэтай хранічнай хваробы.

Брагіншчыну называюць другою Случчынаю. Фактычна яно так і ёсьць. Поруч із сельскай гаспадаркай тут добра разьвівалася малочная справа. Яшчэ да ўвядзеньня абавязкавых паставак дзяржаве малака ад усіх кароў, у часы нэпу недалёка ад Брагіна вельмі добра працаваў масла-сыраварны завод. Гэта быў амаль адзіны завод на ўсю Гомельшчыну.

У раёне пасьпяхова разьвівалася садоўніцтва, цэнтрам якога была вёска Астрагляды. Наколькі добра разьвівалася садоўніцтва, сьветчыць той факт, што дарога, якая праходзіць праз палеткі Астраглядаў, была абсаджаная яблынямі. Цяжка сказаць, ці захавалася што-небудзь ад прыдарожных яблынь астраглядаўцаў. Але важным было тое, што ініцыятыва была добрая й гэтае культурнае пачынаньне знайшло сабе прыклад і ў другіх вёсках.

Мястэчка Брагінь фактычна зьяўляецца вялікай вёскай і цягнецца з канца ў канец на працягу больш трох кілямэтраў. Пасярэдзіне гэтага сяла разьмясьціліся ўсялякія ўстановы, склады ды крамы. Жыхары Брагіна ў васнаўным займаюцца земляробствам. У дарэвалюцыйныя часы ў Брагіне існавала жаночая другаклясная школа для падрыхтоўкі настаўніц царкоўных школаў граматы. Пры саветах тут працавала школа другой ступені.

Пры апісаньні прычыгуначных раёнаў Гомельшчыны мы адзначылі рухлівасьць, растаропнасьць ды ініцыятыву беларуса гэтай мясцовасьці. Цяпер некалькі словаў пра беларуса прыдняпроўца, селяніна, земляроба, які жыве ў воддалі ад вялікага гораду. Рэчычане, брагінцы, лояўцы, камарынцы, хойнічане аддана любяць свой край, мову, дзядоўскія звычаі. Яны адзначаюцца сялянскай упартай працавітасьцю, якая разьлічана не на часовую каньюнктурную ўдачу, а на сыстэматычную працу, бо толькі яна адна можа прынесьці сялянскай сям'і сталы кавалак хлеба й агульны дабрабыт. Селянін ня ўгінаецца перад цяжкай працай, ён толькі бездапаможны перад стыхіяй. Тутэйшы беларус надзвычайна ветлівы, добразычлівы, гасьцінны, ён імкнецца сказаць добрае слова прыемнасьці свайму суседу й лагодна зь ім прывітацца. Там яшчэ можна пачуць такое на першы пагляд архаічнае прывітаньне: «Добры дзень, пані баба!» Бачыце, у гэтым звароце адчуваецца жаданьне сказаць старой кабеце нешта прыемнае, павялічваючае пашану да яе асабістасьці, чымсьці ў звычайным штодзенным прывітаньні.

Не гледзячы на імкненьне ў часы рэвалюцыі й пасьля яе здэнацыяналізаваць і праглынуць гэты абшар нашай бацькаўшчыны, бо на кароткі час падчас рэвалюцыі ён быў захоплены украінцамі, а да канца 1926 г. уваходзіў у расейскую фэдэрацыю, усё-ж такі насельніцтва захавала ў чысьціні сваю мову й пры першай магчымасьці адчыніла беларускія школы. Мы пераканаліся на месцы, што для іх цудоўныя творы з жыцьця нашага народу Янкі Купалы, Якуба Коласа, Цішкі Гартнага зразумелыя й блізкія. Працаўнік майстэрні, чыгункі, церахоўскі адыходнік, праўда, больш рухлівы, але менш устойлівы, ён скарэй забывае традыцыі сваіх продкаў, бо яго дабрабыт часта залежыць ад удачнага выпадку, ад месца працы, якое ён можа дастаць, лепш устроіцца на сэзоннай рабоце й г. д.

Гэтыя раёны Гомельшчыны зьяўляюцца й на гэты час багатаю крыніцаю народнае творчасьці. Таму так і імкнуліся ў Хойніцкі, Брагінскі, Рэчыцкі раёны нашыя кампазытары й дасьледнікі беларускага фальклёру, каб запісаць цудоўную беларускую песьню, казку, прымаўку, якія тут расьсеяныя, як каштоўныя дыямэнты. Не дарма-ж перад вайной у Хойніцкім раёне існаваў лепшы ансамбль народнай песьні й музыкі. Ансамбль складаўся зь вясковых дзяўчат і хлапцоў і сваім чароўным выкананьнем даваў высокую асалоду людзям. Слухаючы народную песьню й музыку ды бачучы скокі ў выкананьні ансамблю, мімаволі пераносішся думкаю ў тыя часы, калі тут па Гомельшчыне вандраваў У. Галубок із сваею трупаю. На паказы Галубка зь яго народнымі песьнямі й скокамі, якія часта адбываліся ў гумнах ды проста пад адкрытым небам, зьбіралася літаральна ўсё акалічнае насельніцтва. Можа Хойніцкі ансамбль і ёсьць тым каштоўным вынікам нястомнай ахвярнай працы, тымі ўсходамі, якія ўжо вырасьлі зь зярнят шчыра й шчодра засеяных сярод беларускага народу народным артыстам Уладыславам Галубком.

На гэтым мы канчаем апісаньне Гомельшчыны, гэтай на сяньня паўдзённа-усходняй часткі нашай бацькаўшчыны. Засталіся неапісанымі вялікія беларускія абшары паза афіцыйнай усходняй мяжой БССР. Там жывуць нашы суродзічы, яны ўвесь час імкнуцца далучыцца да свайго народу. Аднак-жа прыйдзе час, калі штучна адрэзаныя ад свайго народу, яны ўвальлюцца ў вольную незалежную беларускую сям'ю.

**С. Горвальскі**

## А МЫ?...

**Беларускім студэнтам**

**Добра песьні складаць, адсылаць на той сьвет**
**Спачуваньні, паклоны да долу, падзякі...**
**Добра цешыць сябе, што сьвяты запавет**
**З нас да ёты выконвае ўсякі.**

**Добра цела ўмасьціць у выгодны пакой**
**Ды пра Слуцак разводзіць тырады...**
**І расказваць усякаму зь мінай такой,**
**Што у сяньняшні дзень мы ня рады...**

**А ці ўцяміў з нас кажны,**
**што гэта? — Слуцк...**
**Чым спароджаны оды, малітвы збаўленьня?...**
**Хто ўзгiць сабе змог маладую зару,**
**Што на дроце калючым зьвілася цярпеньнем?**

**А над ёю галосяць нямыя гады,**
**Уядаюцца ветры ў скалелыя ночы.**
**Скасьцянелы ад сьцюж, як тады, як тады...**
**Молах новыя жыцьці ахвяраў прарочыць.**

**Ну, а мы? Калі сяньня нам прыйдзецца йсьці?**
**Ці мы хныкаць ня будзем па гэтай плянэце?**
**Ці мо тваняй засядзем у ссохлым трысьці?...**
**Пойдзем сьмерці насустрач? Як Слуцак?...**
**Скажэце!**

**А. Будзіч**

вартаснай глінай, як каолінам, зь якой робяць парцэлянавае й фаянсавае судзьдзё. Каоліністых глінаў ёсьць у Эўропе мала дзе. У Францыі былі досыць вялікія капальні каолінавых глінаў, але яны ўжо падыходзяць да канца вычарпаньня. Францыя пасылала шмат гэтай гліны ў Нямеччыну й мела зь яе вялікі зыск.

На Беларусі каолінавая гліна ёсьць у шмат якіх мясцовасьцях, а найбольш каля Тэлеханаў у Пінскім павеце.

2. **Окравая гліна** або **францускі окр.**

Знаходзіцца яна каля Лоева. З гэтай гліны вырабляецца высока-якасная мука для малявідлаў. З Эўрапэйскіх краінаў окравыя гліны маюць толькі Францыя, Нямеччына, Чэхія й Армэнія.

3. **Агнятрывалыя гліны.**

Моцна трывалыя на агонь гліны знаходзяцца ў старых пластох у Чавускім ды Дарагабускім паветах.

4. **Ганчарная гліна.**

Шмат дзе здабываюць вельмі добрую ганчарную гліну, напр. ля вёскі Ясяніца Наваградзкага павету, ля Ракава Маладэчанскага пав., у Смаленшчыне, Віцебшчыне й інш.

5. **Кахляная гліна.**

Каля Смаленску, Копыся, Івенца ды іншых мясцоў здабываецца добрая гліна для вырабу кахляў.

6. **Цагляная гліна.**

Гліны для вырабу цэглы да будоваў капаюць амаль даслоўна па ўсей Беларусі.

Наагул-жа гліны, як і ўсе іншыя мінэральныя багацьці Беларусі, яшчэ мала навукова дасьледаваныя, хаця знаходзяцца яны амаль на вярху.

### ВАПНА

Вапна спатыкаецца па ўсей Беларусі. Найбольшыя яе залежы знаходзяцца пад Менскам, ля Смаленску, Віцебску, пад Воршай. Аршанская вапна ўважаецца за найлепшую, таму яе яшчэ да вайны 1914 г. найбольш эксплятавалі.

На Віцебшчыне дабываюць **дыляміты.**

Каля Смаленску й у Раслаўскім павеце ёсьць **вапенны туф** — гэта такія дзюркаватыя кавалкі, што вытварыліся ў г. зв. вуглякіслых вапенных крыніцах пры сьцяканьні вады.

Туф і дыляміты — гэта ўжо гатовы, прыгатаваны прыродай матарыял да будаўніцтва, моцны й лёгкі пры працы.

Вапна-ж наагул вельмі неабходны матарыял у будаўніцтве.

### КРЭЙДА

Белая пішучая крэйда ў многіх мясцох Беларусі павылазіла на верх цэлымі горамі, асабліва на паўдзённым ланцугу ўзгор'яў, прыкладам каля Міра й па ўсей Наваградчыне. Праяжджаючы праз гэтыя мясцовасьці, ужо здалёку можна пабачыць сярод палёў белыя, быццам сьнегам пакрытыя, прасторы.

Мясцовыя сяляне дабываюць крэйду ў свой спосаб досыць прымітыўна й адпраўляюць яе ўва ўсе беларускія гарады: Вільню, Менск і інш. Здабываюць яшчэ шмат крэйды ў Раслаўскім павеце, Магілёўшчыне, Аўгустоўскім павеце.

### ГАЗА (НАФТА)

Гэтая сыравіна, бяссумліву, адыгрывае ў сучаснай тэхніцы вялізарную ролю. Галоўнымі прадуктамі, што выраб ляюцца зь яе, ёсьць: бэнзын, карасіна й розныя хімічныя прадукты.

Ці ёсьць газа на Беларусі? Пакуль што ня можна сказаць ані пацьвярджаючы ані адмоўна. А гэта дзеля таго, што шмат якія вучоныя спэцыялістыя цьвердзяць, што ў Беларусі сыравіна гэтая мусіць быць, але паважныя росшукі ў гэтым кірунку ня былі яшчэ прадпрынятыя. Праўда, у 1937 г. адзін селянін Наваградчыны, капаючы студню, наткнуўся на жылу газы, якая яму заліла студню. Селянін склікаў суседзяў. Паглядзелі, пагутарылі, ды што-ж мелі рабіць з гэтай сьмярдзючай жыдзьдзю? Закапалі студню, і на гэтым усё скончылася.

Шмат яшчэ іншых прызнакаў даюць паважныя падставы верыць, што нафта ў нас ёсьць.

Калі яна будзе запраўды выяўлена, дасьць гэта Беларусі яшчэ адну вартасную сыравіну. Але калі-б яе навет і не знайшлося, дык давозіць беларусам гэтага матарыялу прыйшлося-б ня шмат. Хіба пэўную частку бэнзыны, пакуль-бы разьвілася свая прамысловасьць вырабу яе з торфу.

Што тычыцца карасіны для асьвятленьня, дык гэты прадукт, як такі, што раз больш траціць на значэньні. У гарадох яе выціснула электрыка, якая ў шмат разоў таней і выгадней за карасіну. Гэта-ж можна дый патрэбна будзе правесьці і па вёсках, што ўжо праведзена ў цэлым цывілізаваным сьвеце.

Што-ж да рэшты названых намі вышэй прадуктаў, дык некаторыя зь іх, як напрыклад ам'янт (для луджаньня катлоў у мэталюргіі), здабываюцца толькі ў двох ці трох мясцовасьцях на цэлым сьвеце (Мэксыка, Афрыка), дый патрабавалі-б мы яго ў вельмі нязначнай колькасьці.

Медзь-жа, алюміньюм, цынк, волава патрабуецца ў паважнай колькасьці, але-ж пакінем пакуль што іх здабычу іншым народам, бо так мы-бы запраўды дакаціліся да аўтаркіі, да якой, як мы бачылі, не дайшоў ніводзін народ у сьвеце, ды да чаго сяньня ўжо ніхто й ня пнецца.

**Інж. М. Абрамчык**

(Заканчэньне ў наступным нумары)

## Гадавіна Слуцкага Паўстаньня ў Бэльгіі

Стараньнем Саюзу Беларусаў у Бэльгіі, Згуртаваньня Беларускіх Камбатантаў і Беларускага Студэнцкага Згуртаваньня ў Лювэне былі зарганізаваныя сьвяткаваньні 31-ай гадавіны Слуцкага Паўстаньня ў Льежы й Гаршэс 25 лістапада сёлета.

Сьвяткаваньне гадавіны Слуцкага Паўстаньня ў Лювэне паміж студэнцкай грамадой і работнікамі адбылося 2 сьнежаня. Сьвятой Літургіяй і Паніхідай за душы народных змагароў, адпраўленай айцом Смаршчком у беларускай праваслаўнай капліцы ў Лювэне ў прысутнасьці ўсіх мясцовых беларусаў і студэнтаў украінцаў, пачаўся дзень беларускага нацыянальнага сьвята.

Пасьля абеду ў студэнцкім доме адбылася ўрачыстая акадэмія. Старшыня Беларускага Студэнцкага Згуртаваньня сп. В. Рамук адчыніў акадэмію, вітаючы паміж прысутных а. Робэрта ван Кавэлерта, сакратара Дапамаговага Камітэту Беларускім Студэнтам у Бэльгіі. Пасьля заклікаў усіх да аднамінутнай цішыні ў чэсьць беларускіх герояў. Тады студэнцкі хор прасьпяваў жалобны марш «Сьпі пад курганам герояў».

Першым прамаўляў айцец Робэрт ван Кавэлерт. І сяньня, як і некалі на студэнцкім зьезьдзе ў 1949 г., хто першы раз пачуў гэтага вялікага прыяцеля беларусаў, вынес уражаньне, што прамаўляе глыбокі беларускі патрыёта, а не чужынец. Прамоўца згадзіўся з цытатай Старшыні Згуртаваньня рымскай прыказкі, што «соладка памерці за бацькаўшчыну», але зазначыў, што ня меншай заслугай і ня меншым абавязкам кажнага зьяўляецца сьведамасьць жыцьця й працы, працы ахвярнай для Бацькаўшчыны, для ідэалу, за якія паміралі Слуцкія Змагары. Айцец Робэрт сьцьвердзіў, што ідэалізм такі бачыць ён штодзённа ў беларускай студэнцкай групе ў Лювэне. Ён бачыць ахвярнасьць, салідарнасьць і сьведамасьць прабываньня заграніцай на чужым унівэрсытэце, паміж чужынцамі, якія так аб іншых пішуць, як іх бачаць. «Няхай кажны беларус памятае, што ён зьяўляецца амбасадарам сваей краіны на чужыне, што ён яе рэпрэзэнтуе ў кажнай хвіліне й у кажных абставінах» — казаў прамоўца. Далей ён зазначыў, што апінія беспасярэдняя ці даходзячая акружной дарогай Рэктарату Лювэнскага Унівэрсытэту аб беларускай студэнцкай групе зьяўляецца доказам, што яна жыве й ахвярна працуе для зьдзейсьненьня тых-жа мэтаў. «З гонарам сьцьвярджаю — гаварыў апякун беларускае студэнцкае групы — што студэнты беларускія ў Лювэне зьяўляюцца аднэй з найлепшых студэнцкіх чужынецкіх групаў унівэрсытэту... Слуцкія Змагары аддалі ахвярна сваё жыцьцё, пішучы вам запавет, як ідэал, які вы маеце рэалізаваць. Хто болей змагаецца й працуе, той з кажным чынам бліжэй да дасягненьня высокага ідэалу: Незалежнасьці й Вольнасьці Беларусі» — закончыў айцец Робэрт.

Пасьля рэфэрату аб Слуцкім Паўстаньні хор пад кіраўніцтвам кампазытара М. Равенскага прасьпяваў нацыянальны гымн і рад патрыятычных песьняў. Сп. Цьвірка дэклямаваў вершы Н. Арсеньневай і Я. Запрудніка. Вельмі сільнае ўражаньне зрабіў на прысутных дынамічны прызыўны верш Я. Запрудніка «А мы?», зачытаны самым аўтарам.

Малітваю «Магутны Божа» хор пад упраўнаю рукою самога кампазытара закончыў урачыстае сьвяткаваньне.

**А. С.**

## Прэсавая Канфэрэнцыя АБН

У дзень 34-ай гадавіны кастрычніцкай рэвалюцыі 6 лістапада прадстаўнікі народаў, задзіночаных у АБН, наладзілі ў Мюнхэне вялікую прэсавую канфэрэнцыю, у якой прынялі ўдзел шматлікія нямецкія й замежныя прэсавыя агенцтвы, прадстаўнікі паасобных газэтаў і радыя. Справаздачу з гэтай канфэрэнцыі падаём за брытанскім прэсавым агенцтвам «Ройтэр»:

«Прадстаўнікі АБН паставілі сяньня дамаганьне выключэньня Савецкага Саюзу з Задзіночаных Нацыяў і парваньня заходнімі гаспадарствамі дыпляматычных дачыненьняў з СССР і сатэлітнымі гаспадарствамі. Падчас гэтай прэсавай канфэрэнцыі была зачытаная дэклярацыя, у якой было пастаўленае дамаганьне ўстанавіць міжнародны трыбунал дзеля асуджэньня «ваенных праступнікаў» Сталіна, Вышынскага, Мануільскага, Кісялёва, Берута, Готвальда й Чэрвенкава. АБН, які задзіночвае эмігрантаў 23 нацыянальнасьцяў, што знаходзяцца пад Сталінскай і камінформаўскай кантроляй, дамагаўся, каб увесь сьвет прызнаў камуністычную партыю паза законам. Ён дамагаўся таксама вызнананьня антыкамуністычных арганізацыяў паняволеных народаў і іхных вайсковых фармацыяў згодна Гааскай канвэнцыі за ваюючыя арміі.

Прадстаўнікі АБН запратэставалі супраць нядаўна створанага Керэнскім «Савету Вызваленьня Народаў Расеі» й аказваньню яму помачы «некаторымі амэрыканскімі коламі». Яны гаварылі, што заснаваньне гэтага Савету ёсьць першым крокам расейскай імпэрыялістычнай канцэпцыі дзеля захаваньня нявольніцтва пад дэмакратычным плашчам. Ярослаў Стэцько, былы прэм'ер Украіны заявіў: гэткім спосабам Захад пазбаўляе сябе помачы народаў Савецкага Саюзу у сваіх імкненьнях выклікаць унутры ягоным рэвалюцыю. Заходнія гаспадарствы яшчэ дасюль ня вызналі будучага сувэрэнітэту народаў, якія твораць сяньня Савецкі Саюз. Ён сказаў, што ўжо даўно час, каб ЗША распачалі напасьледак афэнзыву супраць СССР».

**Не павінна быць аніводнага працуючага або іншым спосабам зарабляючага беларуса, які-б чытаў «Бацькаўшчыну» задарма! Таксама не павінна быць аніводнага сьвядомага беларуса, які-б яе ня чытаў зусім!**

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011



# Зважай, раўняй на Лювэн!

Лювэн, бэльгійскі горад, ужо ў 14 стагодзьдзі быў сталіцай брабанцкай правінцыі перад паўстаньнем Бруксэлі. Традыцыя кажа, што пачатак яго датуецца ад Юлія Цэзара, але ведамым у гісторыі ён стаўся ў стагодзьдзі 11, як рэзыдэнцыя роду князёў брабанцкіх. У хуткім часе колькасьць насельніцтва ўзрасла да 50 тысяч і Лювэн стаўся шырока ведамым цэнтрам ваўнянай прадукцыі.

У 1425 г. брабанцкі князь Ёган IV заложыў лювэнскі ўнівэрсытэт, які аж да сяньня ёсьць найлепшым у Бэльгіі й шырака знаным ува ўсім сьвеце. У 16 ст. на лювэнскім унівэрсытэце вучылася каля 6 тысячаў студэнтаў. Цяпер там вучыцца 8 тысяч, з чаго прыблізна 600 чужынцаў. Унівэрсытэцкая бібліятэка моцна пацярпела ад ваенных падзеяў абедзьвюх сусьветных войнаў, аднак ужо адрэстаўраваная й налічвае каля 600.000 томаў. Да яе рэстаўрацыі ў вялікай меры спрычынілася ахвярнасьць Амэрыкі й яе былага прэзыдэнта Г. Гувэра, за што ўдзячныя лювэнцы пляц, пры якім знаходзіцца ўнівэрсытэцкая бібліятэка, назвалі пляцам Гувэра. У Лювэне знаходзіцца шмат цікавых і прыгожых старых будынкаў, пераважна ў стылі гатыцкім, а пазьнейшыя — сымпатычны флямандзкі барок.

Сяньня Лювэн па колькасьці насельніцтва ці размаху прадукцыі далёка адстаў ад Бруксэлі, Льежа ці другіх індустрыяльных цэнтраў. Гэты зацішны, спакойны гарадок сядзіць на брабанцкай раўніне ў кантэмпляцыйнай позе вучонага філязофа, які з пагардай адкідае ліхарадачнае тэмпа нашых часоў і пагоню за марнасьцямі дачаснага жыцьця. Бруксэля няпрытомна разьдзіраецца мільёнамі рэклямаў, Льеж перасыпае мільёны тон вугля, — Лювэн-жа пастарому астаецца ціхай, паважнай сьвятыняй навукі й мудрасьці. Моцнае ўражаньне робіць нядзельны канцэрт лювэнскіх званоў у шматлікіх сьвятынях. Мэлёдыйная стройная музыка напаўняе раўніну й адплывае ў вышыню. Гэта музыка льецъ у думкі спакой, цяпло й якуюсьці надзею — у штось лепшае, можа яшчэ нязнанае, прачуванае — але пэўнае...

Да недахопаў Лювэну трэба перадусім залічыць сабачыя галовы бруку, якія праз мае нагнёткі аж за глыбака ўрэзаліся ў маю памяць.

Маю ўражэньне, што гэта жменька геаграфічных, гістарычных і урбаністычных дадзеных аб Лювэне хопіць, як уступ да сяньняшнага артыкулу.

— Чаму Лювэн? — можа хтось спытае.

Таму Лювэн зьяўляецца важным для нас, што зь яго багатых жаролаў чэрпае скарбы веды трыццаць нашых студэнтаў і тут, як па сваей колькасьці, так і якасьці знаходзіцца цэнтр нашай навукі на эміграцыі — гэта нашая гордасьць, надзея. Гэтых трыццаць пар рук у будучыні возьмуць рулі розных галін нашага дзяржаўнага жыцьця; гэтыя рукі маюць фармаваць наш скрыўлены даўгавяковай няволяй і гнётам воблік; гэтых трыццаць напоўненых ведай мазгоў маюць нам расьсьвятляць імглістыя прасторы так жаданага й чаканага заўтрашняга.

Калі шукаючы плоскіх каменьняў у бруку, апошнімі сіламі й цярпеньнем давалакаюся да 19, Hoover Place, яшчэ на вуліцы чую вясёлы гоман свойскай мовы. Што мінуту цераз няшчыльна зачыненыя дзьверы вырываецца на пляц бадзёры рогат. Брук кончыўся, робіцца весялей, падцягваюся, аж усе сібірскія ці ангельскія рэўматызмы ляскаюць, як кастаньеты; скрыўлены, як семдзесят і сем няшчасьцяў твар фармую ў сьмех дэбютанткі выходзячай на сцэну — і ўходжу ў сталовую. Дружны ўзрыў прывітаньня, моцныя й шчырыя поціскі рук — ужо месца пры стале й міска капусты ў беларускім стылі — і жыцьцё стала лёгка, здаецца, не на чужыне, і дваццаць гадоў асталося за парогам на бруку.

Маладзёж вяртаецца да сваіх тэмаў. А сяньня тэма цікавая, бо кучка палескіх «сэпаратыстых» станоўча ўнесла рэзалюцыю аб адлучэньні Палесься ад Беларусі. Хіба што Беларусь захоча прылучыцца да Палесься. Дыскусыя гарачая, а тон ей надае праваднік палескай групы — тут кухар, дзядзька, які ўжо з розных катлоў бяду хлёбаў. Ён у поўнай велічы сваей улады з высокай каронай кухарскай шапкі, як булавой палонікам дырыгуе «крапаснымі», г. зн. дзяжурнымі на кухні студэнтамі й дыскусыяй.

Абед канчаецца. Сталовая пусьцее, а цішыня залягае ў доме. Толькі ідзіце з пакою ў пакой і там застанеце з кніжкамі студэнтаў, которыя грызуць веду аж трэскі сыпляцца.

У другім пакоі нарада актыву якойсьці арганізацыі, у трэйцім цюкаюць на машыне бюлетэнь, у чацьвертым — ізноў грызуць веду. І так аж да вячэры ў доме пры Гувэр пляцы, — цішыня й праца. Вечарам праляцецца па спакойных вулічках, хтось у кіно, хтось на шклянку «Stella» (добрае піва!) і йзноў кніжкі й праца да позьняй ночы. Лаўлю свайго добрага сябру, ведамага на лёнданскім груньце з разгулу й сто дваццаці працэнтавага Дон Жуана: «Ну, як там на шчот бульбы, каб дроў падсмажыць?» — пытаю даўнейшым жаргонам. Круціць галавой: «No money». «Ну дык хоць раскажы, як з «fare amore»?

— Няма, брат, амораў. Тут не Ангельшчына. Ты сядзіш зь дзяўчынай, а ў другім пакоі яе матка падцікаецца зь іконай — гатовая благаслаўляць... Вот ты тут і схапі шылам кашы. Ды і «парлефрансэ» трэба зубрыць. Дагадваюся, што гэта апошняе найважнейшае, бо па колькі яго ведаю — пэўны, што ня толькі матку, але й цэлы тузін ставокіх-аўгураў-цётак сумеў-бы пад манастыр падвесьці, а дзяўчыну ў парк выцягнуць.

Па просту зь месца уцягнуўся ў гэта калясо нікім не накінутай, ніякай уладай не пілнаванай і нявымушанай, але ўсімі перасьцераганай дысцыпліны працы.

І так тут ідзе плённая, упорыстая й ахвярная праца навуковая й грамадзкая, выпрабляюцца характары, пачуцьцё абавязку, сяброўскае сужыцьцё, заціскаюцца вузлы прыязьні.

Студэнтаў тут больш, чым стыпэндыяў, і стыпэндыі ня дзеляцца: кажны мае забясьпечанае жыцьцё, усё, што патрэбнае да навукі, і дастае — што праўда — аж скромную суму грошай на кіно ці папяросы. Але навет з гэтых скромных грошаў студэнты змогуць плаціць складкі ў арганізацыі ці ахвяры на грамадзкія мэты. Ёсьць тут добра зарганізаваны й знаны сярод чужынцаў із сваіх выступленьняў хор, кіпіць грамадзкая работа, ёсьць як-жа сьмелыя, але для гэтых маладых моцных людзей не немагчымыя пляны на будучыню. Безь ненавісьці ці пагарды сьмяюцца з нашага старэйшага пакаленьня, тэй інтэлігенцыі, якая пагналася за дабрабытам і выйшла з радоў грамадзкіх працаўнікоў: «Бог зь імі. Ім самаходы, фрыжыдэркі, ножкі да фаерплейсу... Мы выцягнем!»...

Дай вам Божа! Верым і на вас разьлічваем.

Шмат-бы можна было напісаць аб гісторыі студэнцкага цэнтру ў Лювэне. Як дзесь у 1947 годзе дабілася сюды трох маладых, прагнучых веды людзей. Стыпэндыяў яшчэ ня было й маладыя людзі, каб пражыць, трымаючы перад вачыма кніжкі, абіралі бульбу на кухні. А калі дабіліся стыпэндыяў, прынамсі ня думалі аб сабе, але ўсякімі спосабамі выраблялі месцы й сьцягвалі другіх. Калі ў 1950 г. шырака ведамая, сьмелая й дружная «Дванаццатка» пераехала сюды з Ангельшчыны, стварыўся моцны ідэйны й дзейны цэнтр.

Пішучы пра беларускі студэнцкі цэнтр у Лювэне, ня можна ня ўспомніць аб айцу доктару Робэрце ван Кавэлярто дэ Ваэльс, папулярна называнага «Пэр Робэрто», бо няма магчымасьці аддзяліць аднаго ад другога. Айца Робэрта я сустрэў у Мюнхэне і меў магчымасьць ня цэлую гадзіну гутарыць зь ім, але й гэты кароткі час выясьніў мне тайніцу ягонай папулярнасьці й вялікай міласьці да яго студэнтаў. Гэты шустры, вясёлы, гутарлівы сьвятар, чалавек вялікай веды, шырокіх паглядаў, а адначасна скромны, просты, самарытанска добры. Ня хоча слухаць акіхсьці падзякаў, словаў узнаньня, а барані Божа — камплемэнтаў. Яго ідэя — як найбольш рабіць дабра. Выпрабаваны, адданы прыяцель беларусаў і нашай справы.

Прашу айца доктара Робэрта даравання, што аб ім пішу, але інакш нельга. Прыпамінаюцца мне словы студэнта, зь якім я аб гэтым гутарыў: «Аб а. Робэрце трэба пісаць асьцярожна, бо ён ня хоча слухаць ніякіх падзякаў». Але й ня пісаць немагчыма, калі хтось хоча пісаць пра ЦБАА. Гэта адно з другім неразьдзельнае. Дзякуючы яму, мы тут жывём, як у Бога за пазухай. «Дайце мне — кажа ён заўсёды — добрыя аргумэнты сваімі прыкладнымі паводзінамі ды шчырай навуковай і грамадзкай працай, а аб рэшце паклапачуся я сам».

Будучы коратка ў Лювэне, я спаткаў некалькі людзей з бэльгійскіх таварыскіх ці навуковых сфэраў, якія заглядаюць у студэнцкі дом, прыходзяць на таварыскія спатканьні, цікавяцца жыцьцём і праблемамі беларусаў і шчыра нам прыязныя. Аб студэнцкай моладзі й беларусах гавораць з найбольшым узнаньнем і захапленьнем.

Гэта яшчэ адна — і вялікая заслуга жыхароў дому нумар 19 пры Гувэр пляцы ў Лювэне.

Ужо позная ноч. Выцягваюся на ложку й прабую заснуць, бо заўтра прыйдзецца каратаць ноч у вагоне й пераходзіць пагранічныя кантролі.

«Porteur, venez me retrouver...» Гэта сусед за сьцяной зубрыць «парлефрансэ».

«Shut up!» — крычу яму паангельску. — «Ляж спаць і дай заснуць партэру! Ужо цягнікі ня ходзяць!»

Сусед моўкне, але папера шалясьціць і пад гэты шэлест засыпаю.

Буджуся рана. Асеньні вецер сыпе жменямі сухіх лісьцяў у шыбы. Распачынаецца канцэрт касьцельных званоў. А раптам з за сьцяны:

«Porteur, attendez moi ici!»

«All right, sir!», — крычу бадзёра й выскакваю з пасьцелі.

Вечарам праводзяць мяне на станцыю. Лічу: адзінаццаць хлапцоў. Добра — не дванаццаць: ня будзе Юды.

Сьціскаю ім рукі й, бягучы да цягніка, крычу:

Зважай, раўняй на Лювэн!

4 лістапада 1951 г.

**Сыч**

# Расейская «дэмакратыя»

Брытанская Ліга за Свабоду Эўропы арганізавала 2-га лістапада сёлета ў Лёндане дыскусыйны вечар на тэму прасьледваньня рэлігіі ў Савецкім Саюзе. Ініцыятыва Брытанскай Лігі й выбар тэмы выклікалі значнае зацікаўленьне ў Лёнданскім палітычным сьвеце. Апрача ангельцаў і расейцаў, на сходку прыйшло шмат прадстаўнікоў розных нацыянальнасьцяў Усходняй і Сярэдняй Эўропы, паміж якімі прысутнічалі беларусы й украінцы.

З вуснаў княгіні Атоль, старшыні Лігі, мы даведаліся, што толькі расейцам было даручана выступаць з рэлігійным рэфэратам і адказваць на пытаньні прысутных. Адразу зрабілася ясна, што справа прыймае аднабаковы й вузкі характар.

Даклад прачытаў япіскап Афанаіл, прадстаўнік Расейскай Зарубежнай Царквы. Ён абмежаваўся выключна да прасьледваньня расейскай праваслаўнай царквы й змаганьня расейскіх сьвятароў і вернікаў супраць бальшавіцкай улады, камунізму й афіцыяльнай савецкай праваслаўнай царквы, якая зьяўляецца палітычным аружжам у руках ураду й палітбюро.

Усё тое, што ўладыка Афанаіл сказаў адносна палажэньня расейскай праваслаўнай царквы ў СССР, гэта была шчырая й сумная праўда. Аднак, на жаль, ён адным навет словам ня ўспомніў аб мільёнах беларускіх і ўкраінскіх мучанікаў за праваслаўную веру. Уладыка навет не заікнуўся аб змаганьні й цярпеньні сьвятароў і вернікаў другіх не праваслаўных рэлігіяў у Саветах, як каталікоў, вуніятаў, пратэстантаў, музулманаў і іншых, якіх там прасьледуюць на менш за расейцаў. Такім чынам даклад расейскага япіскапа быў аднабокі й вузка тэндэнцыйны.

Нясьведамыя справы ангельцы й чужынцы атрымалі ўражаньне, што ў савецкай дзяржаве існуе толькі адна царква — расейская і быццам толькі яна адна вядзе змаганьне з бальшавізмам.

Калі падчас дыскусыі А. Надсон, беларус, запытаўся, ці гэта праўда, што расейская царква была заўсёды ўрадавай царквой, што яна служыла й служыць справе расейскай імпэрыялістычнай экспансыі, дык расейцы, зразумела, станоўча запярэчылі. Дык як-жа хутка яны забыліся аб русыфікацыі беларускай і ўкраінскай праваслаўнай царквы, аб прымусовым наварачываньні вуніятаў і каталікоў на праваслаўную веру, аб тым, што ў гэтай русыфікатарскай акцыі галоўную ролю адыгрывала расейская царква.

Дыскусыя хутка перайшла на палітычныя тэмы, якая мела многа цікавых мамэнтаў. Але ўспомнім толькі адзін, які найбольш ярка й вымоўна характарызуе расейскае паняцьце аб дэмакратыі.

Беларус, Янка Пілецкі паставіў пытаньне, што думаюць прысутныя расейцы, што сядзяць за прэзыдыяльным стадом, аб справе самавызначэньня й гаспадарстваўскай незалежнасьці нерасейскіх народаў, паняволеных бальшавізмам. Вось-жа расеец Байкалов адказаў, што дамагацца гаспадарстваўскай незалежнасьці ў сучасных абставінах вельмі недэмакратычна й што ў Расеі ня было й няма ніякага нацыянальнага паняволеньня. Прысутныя пачалі энэргічна пратэставаць і навет халоднакроўныя ангельцы голосна зарагаталі на гэткую дэфініцыю расейскай дэмакратыі.

**Прысутны**

# Беларусы студыююць у Гішпаніі

У гэтым акадэмічным годзе на Мадрыдзкім унівэрсытэце й вышэйшых тэхнічных школах побач із студэнтамі-уцекачамі з краінаў Сярэдняе і Усходняе Эўропы, студыюе гэтаксама групка беларусаў. Гэтая жменька шчасьлівых у няшчасьці людзей апынулася тут дзякуючы жывому заінтэрасаваньню гішпанскага грамадзянства й гішпанскага ўраду лёсам краінаў гэтых выгнанцаў, якія брутальнай сілай былі ўключаныя ў турму народаў маскоўскага камунізму. Гішпанія зразумела забойчае дзеяньне камуністычнай дэструкцыі, а абазнанасьць з камунізмам збліжыла яе з народамі, паўшымі ягонымі ахвярамі.

Пад гішпанскай страхой сабралася досыць значная група — 170 студэнтаў ізь Сярэднай і Усходняй Эўропы, якую складаюць трынаццаць нацыянальнасьцяў, у тым ліку трох беларусаў. Беларуская група ёсьць наймалодшая, бо толькі ў мінулым годзе пачала сваё існаваньне, але ўжо ня ёсьць найменшай. У хуткім часе спадзяёмся прыезду яшчэ аднаго сябры й ёсьць надзеі, што ў будучыні зможа яна яшчэ павялічыцца. Гішпанскія дзейнікі зьяўляюцца зацікаўленымі ў тым, каб зраўняць нацыянальныя групы прапарцыянальна да вялічыні нацыяў. Трэба думаць, што беларусы, якія сюды жадалі-б прыехаць на студыі, атрымалі-б для гэтага ўсю магчымую помач без асаблівых цяжкасьцяў.

Да гэтага часу дзейнасьць нашае групы, побач із студыямі, зводзілася пераважна да паясьненьняў, хто мы такія, адкуль, да чаго імкнёмся й г. д. Вымагае гэта цярплівасьці й высілкаў, бо гішпанцы хіба ў пяршыню спаткаліся зь беларусамі й ім цяжка ўсьведаміць існаваньне вялікага народу, аб якім яны ніколі нічога ня чулі.

Беларусы ўтрымоўваюць цесны кантакт і вядуць супрацоўніцтва зь іншымі нацыянальнымі групамі й адначасна прыймаюць удзел у працы арганізацыяў тутэйшай студэнцкай моладзі. Апошнім часам былі зробленыя захады дзеля наваязаньня лучнасьці й цеснага супрацоўніцтва з Цэнтраляй Беларускіх Акадэміцкіх Аб'яднаньняў з мэтаю ўключэньня нашае групкі ў вагульны рух беларускае студэнцкае моладзі на выгнаньні. Плянуецца гэтаксама стварыць тут, у Гішпаніі, арганізацыйную адзінку беларускіх студэнтаў.

Дзеля аблягчэньня інфармацыйнае акцыі аб Беларусі сярод гішпанцаў і чужынцаў наагул прыступлена да арганізацыі беларускае бібліятэкі ў Мадрыдзе. Асягнем гэта толькі з дапамогай беларускіх выдавецтваў, да якіх хацелі-б зьвярнуцца з гарачай просьбай прысылаць нам свае выданьні, за што будзем вельмі ўдзячнымі. **Я. С.**

## Ад прэсавага прадстаўніка ў Аўстраліі

Дарагія Суродзічы! Кажны з нас напэўна добра разумее вартасьць сваей газэты, сваей кніжкі. Аднак беларуская газэта й кніжка ня валіцца зь неба, а яны выдаюцца вялікімі натугамі й за ахвяры нашых суродзічаў. Таму й нашым абавязкам ёсьць падтрымліваць усімі сіламі беларускае выдавецтва. Тымчасам сярод нас у Аўстраліі ёсьць яшчэ такія, што заказваюць беларускую прэсу, але за яе ня плацяць. Ёсьць і такія, што самі ня выпісваюць газэты, а карыстаюцца пазычанай у сваіх знаёмых. Як адно, гэтак і другое зьяўляецца для нас бязумоўна шкодным, бо падрывае матарыяльную базу беларускіх выдавецтваў. Вось дзеля гэтага мы й змушаныя зьвярнуць на ўсе гэтыя ненармальнасьці спэцыяльную ўвагу й прыняць адпаведныя меры: 1. Усім тым, хто не аплачвае належнасьці за прэсу, будзе ўстрыманая яе высылка. 2. Просіцца ўсіх падпішчыкаў не пазычаць газэтаў іншым, бо кажны можа іх выпісваць сам. 3. Просіцца ўсе арганізацыі й паасобных грамадзян прыдбаць новых падпішчыкаў і падаць адрасы сваіх знаёмых, каб выслаць ім пробныя нумары нашых газэтаў. Ува ўсіх гэтых справах просім зьвяртацца на адрас Прэсавала Прадстаўніка ў Аўстраліі (адрас на адвароце газэты).

**Прэсавы Прадстаўнік у Аўстраліі**

### Інтэрнат для беларускае гімназыяльнае моладзі ў Лювэне

Стараньнем Ураду Цэнтралі Беларускіх Акадэміцкіх Арганізацыяў на Чужыне й пры нязьменнай падтрымцы й дапамозе Сакратара КДБС а. др. Робэрта Ван Ковэлярто дэ Ваэльс ужо адчынены ў Лювэне інтэрнат для беларускае гімназыяльнае моладзі. Хоць пакуль што колькасьць месцаў вельмі абмежаваная, ЦБАА спадзяецца, што ў наступным годзе інтэрнат папоўніцца новымі кандыдатамі з розных краінаў Эўропы.

## «Новая Зямля»

**НА БАЛОНАХ «БАЦЬКАЎШЧЫНЫ»**

**З наступнага нумару «Бацькаўшчыны» пачынаем перадрук «Новай Зямлі» Якуба Коласа — найвыдатнейшага мастацкага твору беларускае літаратуры, беларускай нацыянальнай эпапэі. Хоць гэткім спосабам хочам даць магчымасьць нашым эмігрантам аднавіць знаёмасьць або ў першы раз пазнаёміцца з гэтай слаўнай паэмай. Таму радзім нашым чытачом камплектаваць і старанна перахоўваць усе тыя нумары «Бацькаўшчыны», у якіх будзе перадрукоўвацца «Новая Зямля», бо з прычыны фінансавых цяжкасьцяў няма надзеі выдаць яе потым асобнай кніжкай. Рэдакцыя разьлічвае, што «Новая Земля» будзе перадрукоўвацца ў «Бацькаўшчыне» прыблізна на працягу пяці месяцаў.**

**Было-б вельмі карысным, каб усе беларускія эмігранты мелі ў сябе гэты твор. Таму просім нашых чытачоў заахвоціць іншых выпісваць і стала купляць «Бацькаўшчыну».**

## ПАДЗЯКА

**Ад імя Задзіночаньня Беларускіх Вэтэранаў маю гонар зложыць шчырую падзяку Высокапаважанаму Сьвятару Грэка-Каталіцкай Царквы ў Розэнгайме айцу Сьцяпану Хіроўскаму за безінтэрэсоўна адпраўленую 4. 12. 1951 г. Службу Божую й Паніхіду за загінуўшых Слуцкіх Паўстанцаў і ўсіх змагароў за волю й незалежнасьць Беларускага Народу, спадарыні Марыі Сьвітлік і спадару Сьцяпану Высачанскаму за прыгожае пяяньне падчас Службы Божай і Паніхіды, а таксама ўсім тым, што прыйшлі памаліцца за супакой душаў загінуўшых беларускіх герояў.**

**Розэнгайм, 4. 12. 1951 г.**

**Ал. М.**
**Прадстаўнік**
**Задзіночаньня Беларускіх Вэтэранаў у Розэнгайме**

## ШУКАЮЦЬ

**Міколу Раецкага,** народжанага ў 1928 г. ў вёсцы Пантусавічы Навагрudзкага павету, які загубіўся ў 1944 г. пры эвакуацыі Ліды. Весткі слаць на адрас: Michal Rajecki, Metro Water Supply, Kelmscott, W. A. Australia.

**Сяргіевіча Юльяна** шукае **Сяргіевіч Васіль.** Просьба адгукнуцца на адрас: 9, rue de la Dreve, Harchies, Hainaut, Belgique.

**Мікуліча Пятра,** які быў у амэрыканскай зоне Нямеччыны, шукае сябра. Весткі слаць на адрас Адміністрацыі «Бацькаўшчыны».

## Прадстаўніцтвы „Бацькаўшчыны“

**ПАЗА НЯМЕЧЧЫНАЙ:**

1. **У Бэльгіі:** Mr. Karas Leonid, 19, Place Hoover, Louvain, Belgique.
2. **У Ангельшчыне:** **The Whiteruthenian Editorial Foundation 52, Penn Road, London, N. 7. England.**
3. **У Францыі:** Mr. Symaniec Vladimir, 15, rue du Ltn. Boncour, Neuilly s/Seine, France.
4. **У ЗША:** Mr. B. Danilovich, 222 Suydam St. New Brunsvick, N. J., U. S. A.
5. **У Канадзе:** Mr. Joseph Corny, 270 Clinton Str. Toronto, Ont., Canada.
6. **У Аргентыне:** Asociacion Bielorusa en la Argentina calle Coronel Sayos 2981, 4 de Junio prov. Buenos Aires. Argentina.
7. **У Аўстраліі:** Mr. Jackievic Donat, 60 Fisher Street, East Brisbane, Q-ld, Australia.
8. **У Вэнэцуэлі:** Dudzickj Vladimir, Crucesita a San Miquel 74, Caracas, Venezuela.
9. **У Новай Зэляндыі:** Mr. Karanieuskj Marjan, Burns Izonse, Mosgiel, New Zeeland.

**Непастрэдна з гэтых прадстаўніцтваў просім суродзічаў выпісваць «Бацькаўшчыну» і там-жа разьлічвацца за газэту.**

**ЦАНА «БАЦЬКАЎШЧЫНЫ ПАЗА НЯМЕЧЧЫНАЙ**

| | | |
|---|---|---|
| 1. | ЗША | 15 цэнтаў |
| 2. | Канада | 15 цэнтаў |
| 3. | Вялікабрытанія | 1 шылінг |
| 4. | Францыя | 40 франкаў |
| 5. | Аўстралія | 1 шылінг |
| 6. | Аргентына | 2 пэзо. |
| 7. | Бэльгія | 5 франкаў |

Ува ўсіх іншых краінах раўнавартасьць 15 цэнтаў ЗША за 1 экзэмпляр.

**З прычыны дэвізовых абмежаваньняў у Нямеччыне грошы за «Бацькаўшчыну» з усіх краінаў паза Нямеччынай просім перасылаць на наступны адрас:**

**Mr. Jan Zaprudnik, 19, Place Hoover, Louvain, Belgique.**

**Артыкулы, падпісаныя прозьвішчамі або ініцыяламі аўтараў, могуць выражаць думкі, зь якімі Рэдакцыя не згаджаецца.**

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011